Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 6 (284) | Аўторак, 26 лютага 1957 года | Цана 20 кап.

НАШЫ КАНДЫДАТЫ

Н. Ф. Ермоленка



Калі на сходзе супрацоўнікаў універсітэта паўстала пытанне аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, адным з першых было названа прозвішча Нікалая Фёдаравіча Ермоленкі.

Просты сялянскі юнак раней, і вядомы у рэспубліцы вучоны цяпер—такі працоўны шлях Нікалая Фёдаравіча.

У 1927 годзе Н. Ф. Ермоленка заканчвае хімічны факультэт Маскоўскага універсітэта. У 1930 годзе пасля заканчэння аспірантуры пры Ленінградскім хіміка-тэхналагічным інстытуце, сваю вучоную і педагагічную дзейнасць Нікалай Фёдаравіч цесна звязвае з Беларускім універсітэтам.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Н. Ф. Ермоленка вядзе навуковую работу у Сталінградскім медыцынскім інстытуце, а з 1943 года—у Акадэміі навук БССР і нашым універсітэце.

Амаль за 30-гадовы шлях тав. Ермоленка апублікаваў звыш 90 навуковых прац, якія маюць вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

У 1935 годзе Нікалаю Фёдаравічу была прысуджана навуковая ступень доктара хімічных навук а у 1936 ён быў абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.

З 1947 года тав. Ермоленка—сапраўдны член Акадэміі навук Беларусі. За вялікія заслугі у галіне навукі, за плённую шматгадовую педагагічную дзейнасць прафесар Ермоленка узнагароджан ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцягу і медалем «За доблесны труд у Вялікай Айчыннай вайне 1941—45 гг.»

Вялікі удзел прымае Нікалай Фёдаравіч у грамадскім жыцці універсітэта. Як член таварыства па распаўсюджанню палітычных і навуковых ведаў, ён часта выступае з дакладамі і лекцыямі перад працоўнымі.

Вялікі вучоны-камуніст, акадэмік Нікалай Фёдаравіч Ермоленка сумленна служыць свайму народу.

— Многа яшчэ хочацца зрабіць на карысць Радзімы і народа. Гэтаму прысвячаю ўсё сваё жыццё,—гаворыць Нікалай Фёдаравіч.

З. КАЦ.

ШТО ПАКАЗАЛА СЕСІЯ

Пачаўся другі семестр навучальнага года. Адпачыўшы за час канікул, студэнты зноў запоўнілі аўдыторыі, кабінеты і лабараторыі. Зноў ідуць сваёй чарадой лекцыі, семінары, практычныя заняткі.

Ужо зараз, з першых дзён семестра можна прыкмеціць, што мінулая сесія змяніла адносіны студэнтаў да вучобы. Экзамены паказалі, што толькі той трывала ведае праходзімы матэрыял, хто упарта і настойліва працуе над кнігай на працягу усяго семестра, для каго кніга—сапраўдны сябра і даведнік.

Прайшоўшыя на факультэтах экзамены мелі галоўным чынам адну мэту—выявіць сапраўдныя веды студэнтаў, правільна, аб'ектыўна ацаніць іх веды. Гэтая мэта, у асноўным дасягнута. Калі раней многіх «мітрафанушак» ратавала літаслівасць некаторых экзаменатараў, то ў гэтую сесію лібералізму быў пакладзен канец. Аб гэтым сведчыць памяншэнне колькасці выдатных адзнак і павелічэнне здавальняючых і нездавальняючых.

На гістарычным факультэце колькасць студэнтаў, атрымаўшых здавальняючыя адзнакі, павялічылася з 2 працэнтаў да 10, а колькасць выдатнікаў знізілася з 50 працэнтаў да 38. Рэзка панізілася колькасць выдатнікаў на хімічным, біёлага-глебавым і юрыдычным факультэтах.

Аднак пужацца такога становішча не трэба. Нізкія адзнакі атрымалі тыя студэнты, якія іх заслужылі, тыя, хто забыўся, што ў навуцы няма прамой дарогі, а ёсць цярністы шлях. Хто сумленна працаваў, аддаваў усяго сябе навуцы, той смела ішоў на экзамены, да таго і экзаменатар не «прыдзіраўся». Выдатна вытрымалі выпрабаванні студэнты В. Драко, А. Позняк, Н. Мацюшэўская, М. Неменман (фізмат), А. Кавалеўская, Е. Самускевіч (хімфак). Універсітэт ганарыцца такімі таварышамі.

З самага пачатку навучальнага года ўсім студэнтам было вядома палажэнне аб новым парадку назначэння стыпендый. І у сувязі з гэтым студэнты ведалі аб тым, што да іх будуць прад'яулены больш сур'ёзныя патрабаванні.

Уся вучэбна-выхаваўчая работа рэктарата і грамадскіх арганізацый універсітэта была накіравана на тое, каб палепшыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Калі у мінулыя гады студэнты скардзіліся на перагружанасць лекцыйнымі гадзінамі, то у гэтым навучальным годзе скардзіцца не прыходзіцца—значная колькасць лекцыйных гадзін была знята. Студэнтам прадаставілася магчымасць большую частку працоўнага часу займацца самастойна. Але як выкарыстан гэты час, зноў-такі паказала сесія. Студэнты геолага-геаграфічнага факультэта Мароз, Кастрыца, Марцінчык атрымалі па дзве нездавальняючыя адзнакі, а студэнтка Пітулайніна нават зусім не дапушчана да экзаменаў.

У чым-жа справа? Аказваецца, Кастрыца сістэматычна прапускала заняткі, не выканала праграмы па летняй вытворчай практыцы, не рыхтавалася да практычных і семінарскіх заняткаў. Студэнтка Пітулайніна дрэнна займаецца на працягу чатырох год вучобы. Нездавальняюча здалі сесію Г. Супрановіч, В. Лакіза (фізмат), выключан з універсітэта за непаспяховасць Лісоўскі (гістфак), не быў дапушчан да здачы экзаменаў Г. Ільін (хімфак). Відаць, такія студэнты не ўмеюць і не жадаюць даражыць часам, не паважаюць навуку.

Зараз на курсах, у групах і на факультэтах пачынаюцца камсамольскія сходы, прысвечаныя вынікам сесіі. Камсамольскаму актыву трэба направіць ход кожнага сходу так, каб ні адно слова не было сказана дарэмна. Сур'ёзна падыйсці да вынікаў сесіі, зрабіць глыбокі аналіз і правільныя вывады—такая задача ўсяго студэнцкага калектыву універсітэта.

Абмяркоўваем вынікі экзаменаў і залікаў

У нашым калектыве

Вынікі сесіі паказалі, наколькі добрасумленна, упарта і настойліва працавалі студэнты на працягу усяго поугоддзя.

Мы здавалі два прадметы: гісторыю рускай совецкай літаратуры і гісторыю поуночных і заходніх славян. Неабходна было прачытаць многа мастацкіх твораў. Большасць нашых студэнтаў рыхтаваліся да экзаменаў у кабінетах і чытальных залах юрфака. А вечарамі, амаль штодзённа мы збіраліся у 15 пакоі інтэрната, дзе абмяркоўваліся незразумелыя пытанні або успаміналі змест тых кніг, якія чыталі дауно. Такі метад падрыхтоўкі да экзаменаў дапамог нам глыбей засвоіць матэрыял. З 64 студэнтаў, здаваўшых экзамены, ніхто не атрымаў «нездавальняюча». А такія студэнты, як Налівайка, Кірэева, Напрэеу, Габрынец і іншыя вось ужо трэцюю сесію здаюць толькі на «выдатна».

Зараз студэнты нашага курса пачалі падрыхтоўку да летняй экзаменацыйнай сесіі. Мы зробім усё, каб прыйсці да яе добра падрыхтаванымі.

Р. МІРОНЧЫКАВА,
студэнтка II курса гістарычнага факультэта.

СУР'ЁЗНЫ ЎРОК

Перад сесіяй нас палохала невядомае. І не дарэмна. У час экзамену да студэнтаў былі прад'яулены даволі сур'ёзныя патрабаванні. Але не гледзячы на гэта, многія першакурснікі аддзялення фізікі нядрэнна справіліся з задачай. Лейцына, Жукава, Нячай, Гетманец і многія іншыя здалі экзамены толькі на «выдатна». У гэтым сказауся вынік настойлівай, паусядзённай працы над вучэбным матэрыялам на працягу усяго семестра. Яшчэ большая колькасць студэнтаў атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі. Аднак, не усе дабіліся такіх вышкау. Студэнты Лакіза, Філітовіч, Супрановіч і іншыя часта прапускалі лекцыі, дрэнна рыхтаваліся да практычных заняткаў, таму і на экзаменах атрымалі нізкія адзнакі.

Мінулая сесія паказала, што першыя крокі будучых фізікаў не ва усіх атрымаліся упэўненымі, наглядаліся хістанні і нават—«падзенні». Трэба, каб студэнты якія адчувалі сябе няўпэўнена на экзаменах, зрабілі адпаведныя вывады, і у гэтым семестры працавалі больш сур'ёзна і настойліва.

З. ЕРОШЫНА,
студэнтка I курса аддзялення фізікі.

★

Работа і вынікі

Мінула сесія, праишлі канікулы. Зноу на перапынках стаіць у каліорах вучэбных карпусоў многагалосы шум і гоман. Адпачыўшы, студэнты з новымі сіламі бяруцца за працу, каб у наступнай сесіі не было соромна перад таварышамі за нізкую адзнаку.

На нашым курсе было тры экзамены і чатыры залікі. Многім здавалася, што гэта дробязь,—лежачы на ложку можна вывучыць усё у дні падрыхтоукі да экзаменау і нічога не рабіць на працягу семестра. Так меркавалі і студэнткі Паграбняк і Івашка, якія па усіх трох атрымалі «нездавальняюча».

Студэнткі Некрашэвіч, Леановіч і Барысевіч атрымалі па дзве «тройкі». Гэта таксама вынік дрэннага наведвання лекцый, слабай самастоинаи раооты над кнігай.

Доуга яшчэ можна пералічваць студэнтаў, якія аказаліся не «на узроуні», здалі экзамены нижэй сваіх магчымасцей, не толькі здзівілі гэтым таварышоу, а нават самі разгубіліся, атрымаушы нежаданую адзнаку.

Нядрэнныя вынікі паказалі Власава, Афанасьева, Карабанава і іншыя. Але і яны не змаглі падняць гонар курса на адпаведны узровень. І, на вялікі жаль, у гэтым семестры у нас на курсе няма піводнага выдатніка.

Будзем спадзявацца, што гэты урок пойдзе на карысць, і наступная сесія будзе больш урадліваи на выдатнікау і выдатныя адзнакі.

Л. ДЫЛЯНОК,
студэнтка II курса біялагічнага факультэта.

НЕ ПАЎТАРАЦЬ ПАМЫЛАК

У бягучым навучальным годзе выкладчыцкі склад геолага-геаграфічнага факультэта значна перабудаваў сваю работу. Галоўным дасягненнем з'явілася тое, што студэнты сталі удзяляць больш увагі самастойнай рабоце над кнігай. Пераважная большасць іх рэгулярна рыхтаваліся да лабараторных і практычных заняткаў, з цікавасцю працавалі над дадаткова рэкамендаванай літаратурай. Павышаную цікавасць да вывучаемых дысцыплін можна было бачыць і на шырокім удзеле студэнтаў у рабоце навуковых гурткоў.

Выдатныя веды па усіх прадметах, якія былі вынесены на сесію, паказалі Ю. Тагуноу, Ю. Копысаў, О. Ляховіч, Н. Верэценнікаў, Э. Леукоу (4 курс), І. Афнагель, А. Духоніна, В. Маліноускі, Е. Яковіч (I курс).

Ёсць у нас на факультэце і такія студэнты, якія рыхтавацца да экзаменаў пачалі толькі у дні сесіі. Дрэнныя веды на экзаменах паказалі студэнты Ф. Кучар, В. Мядведзеу Н. Карповіч, (4 курс аддзялення геалогіі), Р. Славецкая, (4 курс аддзялення геаграфіі), Р. Захарэнка, В. Назарэнка (5 курс), і іншыя.

А такія студэнты, як Г. Осіпаў, Паулава, І. Яшчэнка і многія іншыя прыйшлі на сесію зусім не падрыхтаванымі і па заслугах атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Аб адстаючых таварышах, якія ганьбяць увесь факультэт, не жадаюць вучыцца самі і перашкаджаюць іншым, трэба сур'ёзна пагаварыць на комсамольскіх сходах груп, дзе яны займаюцца. З экзаменаў патрэбна зрабіць сур'ёзныя вывады.

Д. КАРУЛІН.

Практыка гісторыкаў

У студэнтаў IV курса гістарычнага факультэта пачалася вытворчая практыка. 64 чалавекі накіраваны у школы Мінска, дзе яны за пяцітыднёвы час павінны правесці па 5—6 урокаў.

Практыканты разбіты на 9 груп, за якімі замацаваны спецыялісты-выкладчыкі — дацэнты Скапцоу, Нячай і іншыя.

Практыка дапаможа студэнтам замацаваць тэарэтычныя веды, атрыманыя у час заняткаў ва універсітэце.

С. ФІЛІПОЎСКІ.

„ПЛАНЕТА" І ЯЕ ПАСТАЯННЫЯ СПАДАРОЖНІКІ

І. Қазакевіч—студэнтка II курса біёлага-глебавага факультэта. Яшчэ ні адна экзаменацыйная сесія не абыйшлася у яе без «правалаў».

Я учиться совсем не могу,
И провалы на каждом шагу.
Почему же опять и опять
Снова требуют пересдавать?
Ох, как страшно сердцу моему...
Почему?—Догадайся, почему?

Яго вядзе ўпартасць і настойлівасць

Вечар... апусцелі аудыторыі... Няроўныя палоскі свету выбіваюцца з-пад дзвярэй кабінета гісторыі КПСС. Тут за апошнім сталом, сканцэнтравана нахмурышы бровы, схілуся над кнігай студэнт. Збоку ляжыць стопка лістоў, спісаных мелкім, роўным почаркам. Выпускнік гістарычнага факультэта Уладзімір Салашэнка працуе над дыпломнай. На хвіліну адарваўшыся ад кнігі, ён здзіўлена глядзіць на апусцеўшыя сталы. Час прайшоў зусім непрыкметна. Пара канчаць на сённешні дзень.

... Апошні год вучобы ва універсітэце. І зараз, калі наперадзе засталася самае адказнае—абарона дыпломнай і дзяржаўныя экзамены, Уладзіміру прыпомнілася, як ён пасля сямігадовай службы ў арміі ўпершыню прышоў на завод...

Таварышы адразу палюбілі яго—чулага, таварыша, умелага арганізатара. Праз месяц Уладзіміра абралі сакратаром заводскага камітэта комсамола. Нялёгка давялося на першых парах. Да яго звярталіся дзесяткі комсамольцаў са сваімі просьбамі, пытаннямі, прапановамі, многія—за дапамогай, парадамі. І кожны чакаў адказу, кожнаму трэба было дапамагчы, правільна параць.

Уладзімір вучыцца ў вячэрняй школе, прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце.

Любіла і паважала моладзь завода свайго комсамольскага важака, дружна, усім калектывам праводзілі яго на вучобу ва універсітэт.

З першых дзён вучобы Уладзімір актыўна уключыўся ў грамадскае жыццё універсітэта. Спадабаецца Уладзіміру комсамольская работа. Ён працуе у комсамольскім, потым партыйным бюро курса, намеснікам сакратара камітэта комсамола універсітэта. Студэнты біёлага-глебавага і геаграфічнага факультэтаў добра памятаюць яго цікавую лекцыю «Аб баявым шляху комсамола».

Зараз выдатнік вучобы Уладзімір Салашэнка рыхтуе дыпломную работу на тэму «Дзейнасць ваенрэукома БССР у жніўні—верасні 1921 года». Многа папрацаваў ён з архіўнымі матэрыяламі, знайшоў цікавыя факты.

— Праз тыдзень мяркую закончыць дыпломную і пачну рыхтавацца да дзяржаўных экзаменаў,—гаворыць Уладзімір.

Наперадзе вялікае і цяжкае выпрабаванне, але Уладзімір вытрымае яго—гэта чалавек моцнай волі, упарты, настойлівы.

Н. КАВАЛЁВА.

НА ЗДЫМКУ: В. Салашэнка за работай над дыпломнай.
Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Вучоныя аб патрэбах БДУ

Адбылася нарада загадчыкаў кафедр і дэканаў факультэтаў універсітэта, на якой абмяркоўвалася пытанне аб выкананні рашэння XX з'езда КПСС і перспектывах далейшай вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы.

З дакладам выступіў прарэктар БДУ па навуковай рабоце Г. А. Павецьеу.

— Вучоныя советы, кафедры нашага універсітэта—гаворыць дакладчык,—прарабілі значную работу па выкананню рашэнняў XX з'езда КПСС аб паляпшэнні падрыхтоукі спецыялістаў на аснове цеснай сувязі навукі з вытворчасцю.

Намі перагледжаны вучэбныя праграмы, тэматычныя планы лекцый і семінарскіх заняткаў, тэмы курсавых работ. У святле рашэнняў XX з'езда КПСС вызначана тэматыка навукова-даследчай работы, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, навуковых сесій і канферэнцый.

Большасць выкладчыкаў універсітэта палепшылі змест лекцый і семінарскіх заняткаў, узмацніли кантроль за самастойнай працай студэнтаў, сталі бліжэй да іх паусядзённых патрэб.

Асаблівую увагу удзяліу тав. Павецьеу палітыка-выхаваўчай рабоце.

— Зараз,—гаворыць ён,—калі імперыялістычная прапаганда імкнецца атруціць свядомасць працоуных краін соцыялізма ядам варожай ідэалогіі, унесці раскол у рабочы рух, перад прафесарска-выкладчыцкім складам універсітэта паустае адказная задача—аберагаць свядомасць студэнтаў ад пранікнення буржуазнай ідэалогіі, быць гатовымі даць ясныя адказы на усе пытанні, якімі цікавіцца моладзь.

Грамадскія арганізацыі і выкладчыкі не павінны мірыцца з утрыманскімі настроямі некаторых студэнтаў. Трэба настойліва уцягваць іх у плённую работу па авалоданню ведамі.

XX з'езд Камуністычнай партыі патрабаваў ад кіраўніцтва ВНУ крутога павароту навукова-даследчай работы да вытворчасці. Цесная сувязь з вытворчасцю неабходна не толькі для аказання дапамогі таму ці іншаму прадпрыемству, але і для таго, каб вырашаць навуковыя праблемы, абапіраючыся на навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі.

Не сакрэт, што мы не маем яшчэ дастатковага абсталявання для поунага размаху навукова-даследчай работы. Але гэты недахоп можна было-б значна паменшыць, калі умела выкарыстаць вытворчую базу і лабараторнае абсталяванне такіх прадпрыемстваў, як аутамабільны, трактарны, радыёзавод і іншыя заводы Мінска.

Кіраўніцтва універсітэта пайшло на пашырэнне аб'ёму навуковых публікацый. Калі у 1956 г. выдавецкі план складау 200 друкаваных аркушаў, то у 1957 г. ён складзе звыш 500.

У спрэчках па дакладу Г. А. Павецьева выступілі кіраунікі кафедр і факультэтаў.

— За апошні час,—гаворыць М. П. Халімановіч,—фізіка-матэматычны факультэт папоуніуся новай групай вучоных. Тым не менш база для правядзення эксперыментальных работ застаецца абмежаванай. Мы не можам на вылучаемыя нам сродкі забяспечыць свае патрэбы у прыборах і абсталяванні. Больш таго, факультэт, на якім займаецца 800 студэнтау, мае толькі 5 вучэбных аудыторый.

Нельга згадзіцца з тымі, хто прапаноувае абмежаваць прыём на фізіка-матэматычны факультэт. Наша рэспубліка мае патрэбу у высокакваліфікаваных спецыялістах—матэматыках і фізіках. А падрыхтаваць іх можна толькі ва умовах, якія забяспечваюць студэнтау сур'ёзнымі тэарэтычнымі ведамі і вытворчымі навыкамі.

— Для паляпшэння падрыхтоукі спецыялістаў,—гаворыць у сваім выступленні прафесар І. С. Лупіновіч,—вялікае значэнне мае чоткая арганізацыя навукова-даследчай работы. Трэба ясна разумець, каго мы рыхтуем, дзе будуць выкарыстаны нашы кадры.

Нельга прызнаць нармальным той факт, што геолага-геаграфічны факультэт, на абсталяванне якога затрачаны вялікія сродкі, пачаў згортваць сваю работу—спынены прыём на аддзяленне геалогіі. Такое-ж становішча і з глебавым аддзяленнем біяфака.

Неабходна больш чотка разабрацца ў планаванні падрыхтоукі кадраў таго ці іншага профілю з улікам патрэо і перспектыў развіцця народнай гаспадаркі.

— Наша рэспубліка,—гаворыць прафесар Б. Н. Ерафееу,—мае патрэбу у высокакваліфікаваных хіміках. Напрыклад, на Мінскім трактарным заводзе ў хуткім часе арганізуецца лабараторыя, для якой патрэбны хімікі. На аутазаводзе таксама арганізуецца буйная вынаходніцкая лабараторыя.

Уся справа заключаецца у тым, каб даць нашым студэнтам трывалыя тэарэтычныя веды і навыкі самастойнага эксперыментавання. А між тым, умовы для гэтага на хімічным факультэце жадаюць быць лепшымі. Пытанне аб сур'ёзнай самастойнай рабоце студэнтаў атрымае сапраўднае вырашэнне толькі пры наяунасці шырокай лабараторнай базы. Важна, каб студэнт пры праходжанні лабараторных практыкумау меу пастаяннае працоунае месца. Тады ён атрымае магчымасць аддаваць рабоце у лабараторыі увесь свой вольны час.

— Пытанне аб політэхнізацыі датычыцца не толькі педагагічных інстытутау,—гаворыць загадчык кафедры гісторыі КПСС Ф. П. Шмыгау.—Яно набывае асобае значэнне і для універсітэта. Карысна было-б у сувязі з гэтым арганізаваць ва універсітэце добрыя майстэрні, наладзіць, выраб навуковага абсталявання і рамонт старога.

Дацэнт Л. В. Шашкоу гаварыу аб тым, што неабходна палепшыць педагагічную практыку студэнтаў, увесці выкладанне псіхалогіі, часцей арганізоўваць экскурсіі у школы, Палац піонераў і г. д.

Пытанню паляпшэння падбора студэнтаў ва універсітэт прысвяціу сваё выступленне дацэнт Д. Е. Фактаровіч. Ён указау, што і надалей трэба прымаць моладзь з прадпрыемстваў, калгасаў, з ліку дэмабілізаваных воінаў.

На нарадзе выступілі дацэнт Ламбін і дацэнт Шыдлоускі. Яны указалі на неабходнасць павышэння патрабаванняў да студэнтаў, абмяняліся думкамі аб выніках мінулай экзаменацыйнай сесіі.

З заключным словам выступіу рэктар універсітэта прафесар К. І. Лукашоў.

Нарада паказала, што прафесарска-выкладчыцкі склад БДУ праявіу рашучасць значна палепшыць вучэбна-выхаваўчую і навуковую работу, да канца выканаць гістарычныя рашэнні XX з'езда КПСС.

А. МАЛАШКА.

Па слядах нашых выступленняў

„Ці такой павінна быць аранжэрэя?"

Пад такім загалоўкам у нашай газеце было змешчана пісьмо, у якім гаварылся аб непаладках, якія перашкаджаюць нармальнай рабоце аранжэрэі.

Пісьмо было накіравана на рэагаванне прарэктару па адміністратыўна-гаспадарчай рабоце Б. Н. Бярэзіну. У адказе, які атрымала рэдакцыя, Б. Н. Бярэзін піша: «Другі год, як у аранжэрэі поунасцю заменена крыша, рэгулярна падаецца цяпло, пастаулены рэгуліруючыя вентылі, але работа ад гэтага не палепшылася. На наш погляд, асноўная прычына недастатковай работы аранжэрэі крыецца ў адсутнасці паўсядзённай увагі з боку загадчыка батанічным садам тав. Ефрэмкінай і адпаведных кафедр біяфака. Падбор раслін, іх утрыманне, размяшчэнне—усё гэта прадстаулена уменню і добрасумленасці садоуніка. Працуе садоўнік амаль бескантрольна. Папаўненне раслін праводзіцца без усякага уліку. Наша аранжэрэя не мае сувязі з аранжэрэяй Акадэміі навук і іншымі аранжэрэямі горада. Многія расліны не правільна размешчаны. Частка кактусаў стаіць на падваконніках, на скразняках, а расліны, якія цяжка пераносяць гарачыню, пастаўлены каля батарэі.

Ці не час біёлага-глебаваму факультэту навесці парадак у аранжэрэі?»

Як вы працуеце над дыпломнай работай?

З такім пытаннем нашы карэспандэнты звярнуліся да некаторых студэнтаў-выпускнікоў. Вось што яны ім расказалі:

Анатолій Сяргееў—выпускнік біёлага-глебавага факультэта:

— Тэма маёй дыпломнай работы—«Бентас палескіх вадаёмаў». Распрацоўку яе я пачаў яшчэ на першым курсе, калі стаў членам навуковага гуртка гідрабіялогіі. Летам 1953 года удзельнічаў у экспедыцыі, у час якой мы вялі даследаванні вадаёмаў на рацэ Прыпяць ад Мазыра да Пінска. Сабраны матэрыял дапамог устанавіць закон развіцця бентаса ў даследаваных вадаёмах.

Такую-ж экспедыцыю мы правялі у 1955 годзе па рацэ Птіч. Параўноуваючы вынікі двух экспедыцый, выявілася, што Прыпяць мае найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця рыбы.

У мінулым годзе была зроблена экспедыцыя на палескія азёры. Даследаванні Чорнага і Белага азёр, возера Мотэль, ракі Ясельда далі матэрыял для напісання курсавой работы. На пасяджаннях гуртка гідрабіялогіі я зрабіу некалькі дакладау па выніках праведзеных экспедыцый. Усё гэта і дапамагае мне у напісанні дыпломнай работы. Хутка яна будзе закончана.

Іван Станкевіч—выпускнік хімічнага факультэта:

— Я працую над дыпломнай работай, прысвечанай пытанню вывучэння сорбцыі крухмалу і селікагела з няводных растворау. Тэма гэтая—новая, мала распрацаваная. Таму распрацоука яе мае вялікае практычнае значэнне.

Па гэтаму пытанню маюцца работы вучонага Думанскага. Дацэнт І. М. Конюшка, пад кіраўніцтвам якога я працую, прапанаваў новы метад вывучэння сорбцыі крухмалу і селікагела ў няводных растворах. Пры дапамозе навейшых прыбораў дасягнута нямала станоўчых вынікаў. Мной ужо зроблена палова работы.

Лена Недасекіна—выпускніца філалагічнага факультэта:

— Для напісання дыпломнай вялікую карысць прыносіць папярэдняя работа, зробленая мною ў навуковым гуртку рускай мовы, дзе я працавала пад кіраўніцтвам дацэнта Базыленкавай. На тэму аб памяншальна-ласкальных суфіксах у творах Салтыкова-Шчэдрына я напісала ў мінулым годзе курсавую работу. Цяпер усё гэта мне, безумоўна, дапамагае пры рабоце над дыпломнай. Цяжкасць заключаецца у тым, што патрэбна зрабіць вельмі многа выпісак—больш 400.

АКАЗВАЕМ МЕТАДЫЧНУЮ ДАПАМОГУ

Вялікую дапамогу студэнтам у справе самастойнага вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі заклікан аказаць кабінет гісторыі КПСС. Кніжны фонд яго сістэматычна папаўняецца грамадска-палітычнай літаратурай. Тут ёсць шматлікія дыяграмы, плакаты па асноўных раздзелах Кароткага курса гісторыі партыі, стэнды матэрыялаў XX з'езда КПСС.

У кабінеце маюцца рэкамендацыйныя спісы, арганізаваны выстаукі кніг, вучэбных і наглядных дапаможнікаў па тэмах чарговых семінарскіх заняткаў, а таксама выстаукі, прысвечаныя важным грамадска-палітычным падзеям і знамянальным датам. Дапамагаючы студэнтам у адшуканні патрэбнага матэрыялу, работнікі кабінета імкнуцца прывіць ім навыкі самастойнай работы над літаратурай. Улічваючы, што многія студэнты пазбаулены магчымасці сачыць за кніжным летапісам і усёй перыядычнай літаратурай, мы вывешваем у кабінеце плакат «Што чытаць з навінак».

У пачатку навучальнага года многія студэнты пры вывучэнні гісторыі КПСС мала знаёміліся з першакрыніцамі, абмяжоўваліся толькі чытаннем брашур па той ці іншай тэме. У гутарках са студэнтамі мы сталі арыентаваць іх на вывучэнне саміх першакрыніц, а не каментарыяу да іх. Выкладчыкі В. І. Мацко, Г. І. Якуб, Г. С. Маханёк, В. М. Сікорскі правялі некалькі гутарак аб тым, як правільна весці канспекты.

Кіруючыся рашэннямі XX з'езда КПСС аб паляпшэнні выкладання грамадскіх навук, мы падбіраем патрэбныя ілюстрацыі, у якіх імкнемся паказаць рашаючую ролю народных мас у гісторыі, кіруючую ролю партыі ў комуністычным будаўніцтве, саюз рабочага класа і сялянства, дружбу народаў СССР. Як дадатковы матэрыял пры вывучэнні гісторыі партыі рэкамендуем мастацкую літаратуру. Так, напрыклад, пры праходжанні раздзела «Рабочы рух і распаусюджанне марксізму ў Расіі» былі рэкамендаваны такія творы, як «Фама Гардзееу», «Справа Артамонавых», «Жыццё Клима Самгіна» Горкага, «Горад у стэпу» Серафімовіча, «Сон Макара» Караленкі і іншыя.

Усе нашы намаганні накіраваны на тое, каб дапамагчы студэнтам набыць глыбокія і трывалыя веды тэорыі, выпрацаваць самастойнасць мышлення, ініцыятыву ў вырашэнні навуковых пытанняу.

Аднак у сваей працы мы сутыкаемся з некаторымі цяжкасцямі. Перш за ўсе мы не маем памяшкання для правядзення кансультацый. Даючы кансультацыю у кабінеце, выкладчык тым самым перашкаджае працаваць іншым студэнтам, якія прыйшлі сюды, каб падрыхтавацца да наступных семінарскіх заняткаў.

Дауно пара папоўніць кабінет мэбляй, набыць шафы. Мы некалькі разоў звярталіся за дапамогай да адміністрацыі, але нашы просьбы застаюцца без увагі.

І. ГАРБАЛЕНЯ,
загадчык кабінетам гісторыі КПСС.

НАСУСТРАЧ ФЕСТЫВАЛЮ

БОЛЬШ КВЕТАК!

Кожны дзень набліжае нас да вялікай, хвалюючай падзеі—Сусветнага фестывалю моладзі. Зараз юнакі і дзяучаты у розных кутках зямлі робяць усё магчымае, каб дні фестывалю былі святам міру і дружбы, каб яшчэ больш палепшыць узаемаадносіны розных народаў. Сёння кожны павінен падумаць аб тым, які уклад ён можа зрабіць, каб не быць у баку ад гэтага цудоунага свята юнацтва.

Юнакі і дзяучаты Мінска будуць сустракаць у сябе многіх зарубежных гасцей. Каб сустрэчы гэтыя былі радаснымі, пышнымі, трэба упрыгожыць іх кветкамі.

Мы, студэнты-біёлагі, павінны зрабіць усё, каб кветак было многа, каб сустрэчы былі цёплымі, сардэчнымі. Фестывальны камітэт біёлага-глебавага факультэта заклікае усіх студэнтаў універсітэта і перш за усё біёлагаў—вырасціць да фестывалю як мага больш кветак. Возьмемся-ж за справу, сябры!

Фестывальны камітэт біяфака.

ЗРОБІМ СВАІМІ РУКАМІ!

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя В. І. Леніна з'яуляецца старэйшай і разам з тым адной з буйнейшых вышэйшых навучальных установ Беларусі. На сямі факультэтах БДУ займаецца ў сучасны момант звыш 3 тысяч чалавек на стацыянары і каля 3 тысяч—на завочным факультэце. Толькі на стацыянары колькасць студэнтаў узрасла ў параунанні з даваенным 1940 годам амаль у два разы.

А вучэбная плошча для заняткаў студэнтаў універсітэта засталася амаль такой-жа, якой была да вайны. Калі прыбавіўся корпус юрыдычнага факультэта, то значная частка былых аудыторый адыйшла пад кабінеты і лабараторыі, многія пакоі заняла адміністрацыя. І калі з вучэбнымі аудыторыямі пасля наладжання заняткаў у дзве змены стала крыху лепш, то становішча з памяшканнямі для навуковай, культурна-масавай і фізкультурнай работы прадаужае заставацца цяжкім.

На шматлікі калектыў універсітэта маецца чытальная зала усяго на 200 месц. Невялікі спартыуны зал не можа задаволіць вялікага калектыву фізкультурнікаў. Што датычыцца памяшканняу для правядзення культурна-масавай работы, то БДУ мае толькі клуб, які не можа умясціць ават палову любога з факультэтаў, бо ён разлічан усяго на 240 месц.

І не дзіуна, што мы, студэнты 5-га курса гістарычнага факультэта, не знаёмы з большасцю выпускнікоу іншых факультэтау, многія пакоі заняла адміністрацыя. І калі з вучэбнымі аудыторыямі пасля наладжання заняткаў у дзве змены стала крыху лепш, то становішча з памяшканнямі для навуковай, культурна-масавай і фізкультурнай работы прадаужае заставацца цяжкім.

На шматлікі калектыў універсітэта маецца чытальная зала усяго на 200 месц. Невялікі спартыуны зал не можа задаволіць вялікага калектыву фізкультурнікаў. Што датычыцца памяшканняу для правядзення культурна-масавай работы, то БДУ мае толькі клуб, які не можа умясціць ават палову любога з факультэтаў, бо ён разлічан усяго на 240 месц.

І не дзіуна, што мы, студэнты 5-га курса гістарычнага факультэта, не знаёмы з большасцю выпускнікоу іншых факультэтаў, многія пакоі заняла адміністрацыя. І калі з вучэбнымі аудыторыямі пасля наладжання заняткаў у дзве змены стала крыху лепш, то становішча з памяшканнямі для навуковай, культурна-масавай і фізкультурнай работы прадаужае заставацца цяжкім.

На шматлікі калектыў універсітэта маецца чытальная зала усяго на 200 месц. Невялікі спартыуны зал не можа задаволіць вялікага калектыву фізкультурнікаў. Што датычыцца памяшканняу для правядзення культурна-масавай работы, то БДУ мае толькі клуб, які не можа умясціць ават палову любога з факультэтаў, бо ён разлічан усяго на 240 месц.

І не дзіуна, што мы, студэнты 5-га курса гістарычнага факультэта, не знаёмы з большасцю выпускнікоу іншых факультэтаў, многія пакоі заняла адміністрацыя. І калі з вучэбнымі аудыторыямі пасля наладжання заняткаў у дзве змены стала крыху лепш, то становішча з памяшканнямі для навуковай, культурна-масавай і фізкультурнай работы прадаужае заставацца цяжкім.

Але пытанне аб гэтых памяшканнях для універсітэта можна вырашыць, на наш погляд, без вялікіх капітальных затрат. І вось такім чынам.

Біялагічны і хімічны карпусы раздзелены паміж сабой праходам у 25 метраў. Калі-ж злучыць гэтыя карпусы, пабудаваўшы дзве сцяны, і адначасова гэтую частку зрабіць чатырохпавярховай, і надбудаваўшы чацверты паверх над выступаючымі крыламі карпусоу (над 58 аудыторыяй біякорпуса і над спортзалам хімкорпуса), універсітэт меу бы магчымасць вырашыць адразу чатыры задачы: павялічыць у 2—2,5 разы спартыуную залу, у 2 разы спартыуную залу, расшырыць памяшканне для заалагічнага музея, і, нарэшце, у 2 разы павялічыушы 58 аўдыторыю і падняушы столь шляхам пабудовы чацвертага паверху, зрабіць добрую актавую залу.

Аб гэтым праекце ішла размова раней. Усе згаджаліся, што гэта добрая прапанова, але калі нехта кінуў рэпліку, што гэта не архітэктурнае вырашэнне пытання, аб праекце спыніл гаварыць.

Мы не спецыялісты ў архітэктуры, але лічым, што калі будзе ажыццёулена наша прапанова, агульны выгляд універсітэта не стане горшым.

Што-ж датычыцца затрат на гэтае будаўніцтва, то мы прапануем будаваць аб'ект сваімі сіламі, шляхам працоунага удзелу студэнтаў, і капітальныя затраты звядуцца толькі да стоімасці матэрыялу. Мы лічым, што ні адзін студэнт не адмовіцца папрацаваць на будаўніцтве памяшкання для свайго універсітэта, а сам удзел у карыснай працы студэнтау будзе садзейнічаць згуртаванню, умацаванню і выхаванню студэнцкага калектыву.

Мы заканчваем у гэтым годзе універсітэт. Нам ужо не давядзецца карыстацца выніками прапануемага намі будаўніцтва, аднак мы, пяцікурснікі, з задавальненнем папрацуем для карысці свайго універсітэта, які дау нам самае вялікае—веды.

СТУДЭНТЫ З ГРУПЫ V КУРСА ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.

Каля 6.000 экспанатаў мае наш заалагічны музей. За 24 гады яго існавання тысячы наведвальнікаў пабывалі ў ім. Толькі ў гэтым годзе у музей зроблена 245 экскурсій і ужо каля двух дзесяткаў—на працягу студзеня і лютага 1957 года.

НА ЗДЫМКУ: загадчык музеям тав. Варонін знаёміць экскурсантаў з экспанатамі.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ЯК МЫ МЯРКУЕМ ПРАВЕСЦІ СВОЙ ФЕСТЫВАЛЬ

Моладзь усяго свету з цікавасцю сочыць за тым, як ідзе падрыхтоўка да VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які адбудзецца летам гэтага года ў Маскве. Зразумела, толькі невялікі працэнт «шчасліўцаў» з мільёнаў юнакоў і дзяучат зможа пабываць на Маскоўскім фестывалі. Аднак, кожны па-свойму рыхтуецца да яго: хто развучвае новыя песні і танцы, хто вывучае замежныя мовы або эсперанто, хто рыхтуе падарункі дэлегацыям замежнай моладзі.

У вялікай і шматграннай праграме Сусветнага фестывалю вялікае месца адводзіцца спецыяльна для студэнтаў. Будуць арганізаваны міжнародныя семінары студэнтаў, сустрэчы і канферэнцыі студэнтаў розных кантынентаў і краін свету. У дні фестывалю ў Маскве будзе працаваць міжнародны студэнцкі клуб, студэнты усяго свету сустрэнуцца з буйнейшымі вучонымі Совецкага Саюза і замежных краін.

У якасці падрыхтоўчых этапаў да Сусветнага фестывалю праводзяцца фестывалі у школах і ВНУ, на прамысловых прадпрыемствах і у калгасах, у гарадах і вёсках нашай краіны. Рыхтуецца да свайго першага фестывалю і наш універсітэт.

Многіх цікавіць пытанне: а якжа будзе праходзіць фестываль у нас, ва універсітэце? Зразумела, даць вычарпальны адказ на гэтае пытанне зараз цяжкавата, бо многія дэталі яшчэ не ясныя. Тым больш патрэбен абмен думкамі па гэтаму пытанню. І чым больш студэнтаў і выкладчыкаў выкажуць сваю думку, тым цікавей пройдзе наш фестываль.

Мы думаем пачаць фестываль першым перадфестывальным вечарам. Будзе праведзен рад платных вечароу для стварэння грашовага фонду фестывалю.

Зараз на факультэтах вядзецца падрыхтоука да факультэцкіх фестываляў. Гэтыя святы намечана павесці з 1 па 25 сакавіка. Яны ўключаць у сябе канцэрты мастацкай самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы, танцы, гульні, атракцыёны. На вечарах будуць прысутнічаць члены журы па агляду факультэцкіх фестываляў.

Адначасова з гэтым мы правядзем конкурсы па розных жанрах: харавыя і сольныя спевы, класічныя і народныя танцы, выкананне на розных музычных інструментах, вершы, сатырычныя праграмы і г. д. Пераможцы конкурсаў прымуць удзел у раённых конкурсах, якія пачнуцца з 18 сакавіка. Пераможцы конкурсаў атрымаюць узнагароды—дыпломы лаурэатаў першага універсітэцкага фестывалю, граматы рэктарата, каштоўныя падарункі. Узнагароджаны будуць таксама кіраўнікі лепшых калектываў мастацкай самадзейнасці, комсамольскія і профсаюзныя актывісты, якія добра папрацавалі ў час падрыхтоўкі да фестывалю.

З сакавіка адбудзецца конкурс на лепшыя інтэрнат і пакой. У красавіку сіламі студэнтаў правядзецца добраупарадкаванне тэрыторыі БДУ і інтэрнатаў: будуць створаны клумбы і газоны, пасаджаны кветкі. У гэтай важнай справе галоўную ролю павінны адыграць студэнты біёлага-глебавага факультэта.

Пасля правядзення фестывалю ў Маскве наш горад наведае больш тысячы прадстаўнікоу замежных маладзёжных арганізацый Германіі, Польшчы, Бельгіі, Галандыі, Люксембурга, Ліхтэнштэйна. Яны пазнаёмяцца са славутасцямі Мінска, наведаюць прадпрыемствы, будоўлі, навучальныя установы. Многія з іх пабываюць ва універсітэце, будуць жыць у нашых інтэрнатах. А каб аказаць ім дастойную сустрэчу, нам патрэбна добра падрыхтавацца: вырасціць многа кветак, прыгатаваць падарункі ад універсітэта, факультэтаў, індывідуальныя. Вельмі добрым падарункам для зарубежнай моладзі былі-б, напрыклад, фотаальбомы, якія адлюстроуваюць жыццё, вучобу і быт студэнтаў Беларускага універсітэта.

Заключную частку універсітэцкага фестывалю мы мяркуем правесці у маі на адкрытай пляцоуцы, каб арганізаваць сапрауды цікавым і захапляючым, нашы комсамольскія і профсаюзныя актывісты, у першую чаргу культмасавікі, павінны як мага больш прыцягнуць студэнтаў усіх курсаў, факультэтаў да удзелу у фестывалі, праявіць максімум ініцыятывы, выдумкі, вынаходніцтва. І чым больш мы будзем прыслухоувацца да голасу студэнтаў, чым больш студэнты і выкладчыкі падкажуць універсітэцкаму і факультэцкім фестывальным аргкамітэтам цікавых мерапрыемстваў, тым лепшым будзе наш фестываль.

Чакаем вашых прапаноу, дарагія таварышы!

Е. БАБОСАЎ,

У час зімовых канікул

Мы пабывалі ў Ленінградзе

Мне пашанцавала у час зімніх канікул у ліку сямі нашых студэнтаў пабываць у Ленінградзе на традыцыйнай сустрэчы студэнтаў некалькіх універсітэтаў краіны, арганізаванай Ленінградскім універсітэтам імя А. А. Жданава.

4 лютага адбыуся гэты доугачаканы вечар. Прадстаўнікі раду ВНУ расказали аб жыцці, вучобе і працы сваіх студэнтаў, аб тых сувязях, якія устанавіліся паміж моладдзю розных навучальных установ Ленінграда, Масквы, Мінска, Кіева і іншых гарадоу.

На вечары выступілі калектывы мастацкай самадзейнасці Маскоўскага і Ленінградскага універсітэтаў.

Усе астатнія дні мы знаёмілся са славутасцямі Ленінграда. Наведали шматлікія музеі горада, пазнаёмілся з цудоунымі помнікамі архітэктуры, пабывали у Смольным і на «Ауроры».

Асаблива незабыунае уражанне пакінулі Эрмітаж і Рускі музей, дзе захоуваюцца багатыя скарбніцы рускай і сусветнай культуры. Мы наведали Петрапаулаускую крэпасць, Музей рэлігіі і атэізма, Ваенна-Марскі музей, Музей М. В. Ламаносава.

Тыя няміогія дні, якія мы правялі у гэтым цудоуным горадзе, застануцца у нашай памяці на усе жыццё.

Э. ШАЛАЕВА.

Ніну Плашчынскую і Надзежду Гурын, студэнтак філалагічнага факультэта, часта можна бачыць за вышыукай. Гэтай любімай справе яны аддаюць свой вольны час.

НА ЗДЫМКУ: Н. Плашчынская з цікавасцю разглядае вышыуку сяброўкі.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Кніга аб А. С. Пушкіне

У бліжэйшы час у выдавецтве універсітэта выходзіць кніга доктара філалагічных навук прафесара І. В. Гутарава. «Философско - эстетические взгляды А. С. Пушкина».

Аўтар працы у даходлівай для шырокага кола чытачоу форме выкладае погляды на прыроду, грамадскае жыццё самага патрабавальнага майстра у галіне мастацкага атабражэння жыцця А. С. Пушкіна.

Арыгінальная частка працы, дзе аутар гаворыць аб атэізме А. С. Пушкіна, яго грамадска-гістарычных поглядах.

Каштоуныя раздзелы працы, у якіх І. В. Гутарау выкладае літаратурна-тэарэтычныя выказванні А. С. Пушкіна аб паэтах і паэзіі, літаратурных напрамках, творчым працэсе і мастацкай крытыцы.

НОВЫЯ ВЕРШЫ НАШЫХ ПАЭТАЎ

Сямён БЛАТУН

ТЫ ПРЫДЗЕШ

Няхай мароз скубе мяне за вушы,—
Цябе чакаць я буду хоць да рання.
Ты прыдзеш і адгоніш сцюжу,
Ніоы вясна, сваім дыханнем.

Павольна толькі вось бягуць хвіліны,
І у галаве больш блытаецца проза.
А час марудзіць ...Ці мо' то гадзіннік
Не ходзіць, а застыу з марозам.

А я усёроуна буду крокі мерыць,
Чакаць цябе гатовы хоць да рання.
Ты прыдзеш, сэрца у гэта верыць,
І мы прызначым зноу спатканне.

ЮЛІУСУ ФУЧЫКУ

«Люозі, я любіу вас, будзьце пільными...» Ю. Фучык.

Іржой пакрытыя цяжкія краты,
Турэмны холад надрывае грудзі...
А ён пісаў, забыушыся пра катаў,
«Я любіу вас, людзі...»
Не задрыжэла сэрца камуніста
У міг апошні (болей жыць не будзеш!)
Пагляд адкрыты страпяную фашыстаў,—
«Я любіу вас, людзі...»
Ды толькі каты слоу не расстраляли,
Яны звіняць у шматмільённым гудзе
Адлітыя з крыві—пярвейшай сталі:
«Я любіў вас, людзі...»
Партрэт з усмешкай, нібы зоры, чыстай
Больш светлыя успаміны будзіць,—
Здаецца, шэпчуць губы комуніста:
«Я люблю вас, людзі...»

Рыгор Барадулін

У роднай хаце

Нарэшце, я у роднай хаце,
У сценах гэткіх дарагіх.
Зноу пра жаніцьбу кажа маці,
І пра чужых нявестак злых.
Ніжэйшай, меншай стала хата...
Будзільніка знаёмы стук...
Дзяцінства чарамі багаты
Тут у падлозе кожны сук.
Мне гэты прыпечак знаёмы
І кожны вілачнік сухі,
Парог, што у шлях адзін—дадому
Заусёды зводзіць усе шляхі.
Парог, пасечаны, шурпаты,
(Зрабіу яго чарнейшым час):
Зімой дрывотняй і варштатам
Служыу ён удаве не раз.
Тут кожны кут яшчэ чароуней
І даражэй для сэрца стау.
І фікус, што я флянцам помню,
Упёрся у столь ілбом ліста...

Уладзімір КАРЫЗНА

* * *

З ёй стаяу каля дрэуца,
Што шуміць пры дарозе...
Ён казау: «Як мне любы
Косы белай бярозы.»
Пазіраў ён у вочы—
Глыбіня іх, што мора...
Гаварыў пра крыніцы,
Пра вугельчыкі зорак...
Потым змоукліі, і чуем:
Ліст на дрэве трапеча...

Не я—сэрца сказала:
«Як люблю гэты вечар!»
«Як люблю гэты вечар!»
Азарыла, што зляннем.
Зразумела дзяучына
Майго сэрца жаданне.
«Вось што,—шэпча яна мне—
Ды кажы ты усе прама!..»
«Я... кахаю цябе».
«...І цябе я таксама».

Юрась Свірко

ЛАСІХА

Там, дзе шуміць стагодні бор,
Там, дзе цячэ Бяроза ціха,
Абудзіць поуначу прастор
Хрыпатым голасам ласіха.
Ёй надакучыла адной,
І у смутку друга яна кліча.
Лася тут, восенню глухой
Забіу бяздушна паляунічы.
І хаця снег сляды загнау,
Павіс на ёлках і на хвоях,
Заужды тут спыніцца яна,
Калі ідзе да вадапою.
Не верыць цішыні начной
Хаця і спяць лясныя нетры.
Глядзіць яна перад сабой
І доуга нюхае паветра.
Яна магла-б і без трывог
Ісці каля кустоу сасёнак,
Калі-б за ёю крок у крок
Не бег напуджаны ласёнак.

Да прадстаячых выбараў у Чырвоны Крыж

Комуністычная партыя, Совецкі урад праяуляюць вялікія клопаты аб ахове здароуя насельніцтва. Гэтыя клопаты асабліва ярка былі прадэманстраваны у рашэннях XX з'езду КПСС. Задачы, пастауленыя у гэтай галіне,—вялікія, і вырашыць іх можна толькі з удзелам самога насельніцтва.

Арганізацыі таварыства Чырвонага Крыжа на прадпрыемствах, у навучальных установах, калгасах, МТС з'яуляюцца надзейнымі памочнікамі медыцынскіх работнікаў у правядзенні санітарных мерапрыемстваў.

Чырвоны Крыж—адна з самых масавых добраахвотных грамадскіх арганізацый у нашай краіне. Ён заклікан аказваць усямерную дапамогу работнікам аховы здароуя, настойліва папярэджваць хвароoы, змагацца за умацаванне здароуя і працяг жыцця совецкага чалавека—будаўніка комуністычнага грамадства.

Побач з гэтым, Совецкі Чырвоны Крыж праводзіць сярод насельніцтва вялікую санітарна-абаронную работу, знаёміць насельніцтва, санітарны актыу з пытаннямі абароны ад масавых сродкаў паражэння.

Выкананне задач, якія стаяць перад таварыствам Чырвонага Крыжа, немагчыма без добра арганізаванай работы пярвічных арганізацый гэтага таварыства.

Пярвічнай арганізацыяй Чырвонага Крыжа Беларускага універсітэта (старшыня—студэнтка 5-га курса геаграфічнага факультэта тав. Палер) праводзіцца вялікая работа па уцягненню студэнтаў у члены таварыства. На сённешні дзень іх налічваецца 560 чалавек, сабрана 1123 рублі членскіх узносаў. 400 чалавек з'яуляюцца рэзервнымі донарамі.

Ва універсітэце створаны атрады санітарных фарміраванняу, аб'ектавая сандружына.

Але у рабоце пярвічнай арганізацыі Чырвонага Крыжа універсітэта маецца нямала недахопаў. Не усе студэнты з'яуляюцца членамі таварыства, не жадаюць займацца па 30-гадзіннай праграме ГСО. Сярод студэнтаў праводзіцца мала лекцый і гутарак на адпаведныя тэмы.

Раённы камітэт Чырвонага Крыжа выражае поўную упэуненасць у тым, што комсамольская арганізацыя універсітэта дапаможа наладзіць работу пярвічнай арганізацыі Чырвонага Крыжу у БДУ.

В. ЖУЁУСКАЯ,
старшыня Ленінскага раённага камітэта Чырвонага Крыжа.

ПЫТАЕШСЯ—АДКАЗВАЕМ

ПРОПИСНЫЕ БУКВЫ

Новый свод «Правил русской орфографии и пунктуации» устанавливает твердые правила и в области правописания прописных букв. Этому вопросу посвящается в «Правилах» специальный раздел.

В употреблении прописных букв в собственных именах наблюдались ранее наиболее частые колебания. Например, писали: **Иван-да-Марья** и **иван-да-марья**, Тургеневские **«записки охотника»** и **«Записки охотника** и т. д.

Теперь в «Правилах» дается подробный перечень правописания прописной буквы в именах собственных, куда включаются условно и наименования учреждений и организаций, должностей и званий, орденов, медалей и других знаков отличий.

Особое внимание уделено составным наименованиям разного типа: фамилиям и личным именам, соединенным с прозвищами или дополнительными наименованиями **(Владимир Красное Солнышко, Соловей Разбойник, Ричард Львиное Сердце, Петр Первый)**; иностранным фамилиям и именам с артиклями частицами, которые пишутся со строчной буквы **(фон дер Гольц, Абд эль Керим, Леонардо да Винчи, Бодуэн де Куртене)**. Отдельно говорится о правописании китайских фамилий (они обычно стоят перед именами), которые пишутся слитно, независимо от числа слогов, и начинаются с прописной буквы. В китайских именах (они стоят после фамилии) первая часть начинается с прописной буквы, вторая пишется со строчной и присоединяется к первой дефисом, например. **Цяо** (фамилия) **Гаунь-хуа** (имя), **Мао Цзэ-дун, Чжоу Энь-лай, Чэнь И.**

В личных фамилиях и именах корейцев, вьетнамцев, бирманцев и индонезийцев все части пишутся с прописной буквы и дефисом не соединяются, например: **У НУ, Хо Ши Мин, Ким Ир Сен.**

Подробно излагаются правила индивидуальных названий астрономических и географических объектов разных типов **(альфа Малой Медведицы, мыс Доброй Надежды, Военно-Грузинская дорога, улица Кузнецкий Мост)**; названий исторических событий, эпох, а также исторических документов, произведений науки, искусства и литературы **(Парижская коммуна, Петровская реформа, Версальский мир, Венера Милосская, Русская правда)**; полных названий орденов **(орден Трудового Красного Знамени, орден Отечественной войны I степени, орден «Знак почета»** и т. д.).

Для официальных составных наименований государственных учреждений и общественных организаций дается общее правило о написании с прописной буквы только первого входящего в них слова **(Министерство иностранных дел, Академия наук СССР, Российская социал-демократическая рабочая партия, Народная палата Индии)** с перечнем тех названий высших партийных, правительственных и профсоюзных учреждений, а также названий некоторых международных организаций, в которых с прописной буквы пишутся все входящие в их состав знаменательные слова (кроме слова **«партия»**). Напрп- Например: **Коммунистическая партия Советского Союза, Всесоюзный Ленинский Коммунистический Союз Молодежи, Организация Объединенных наций.**

Дается также перечень тех составных наименований высших должностей и почетных званий в СССР, в которых все слова пишутся с прописной буквы, например: **Председатель Президиума Верховного Совета, Маршал Советского Союза, Герой Социалистического Труда.**

С прописной буквы пишется первое слово в названиях революционных праздников и знаменательных дат, например: **Первое мая, Международный женский день, Новый год, Девятое января.** Но если начальное порядковое числительное в таком сложном названии написано цифрой, то с прописной буквы пишется следующее за ним слово, например: **1 Мая, 9 Января.**

В «Правилах» устанавливается, что со строчной буквы должны писаться только имена и фамилии, которые полностью превратились из имен собственных в имена нарицательные и, в частности, те, которые употребляются в презрительном смысле, как родовые названия, например: **ловелас, донжуан, меценат, квислинг.** Этим правилом должно быть внесено ограничение в написания со строчной буквы при таком употреблении имен и фамилий с презрительным оттенком (обычно в форме множественного числа), которые не получили общераспространенного и устойчивого характера.

С прописной буквы пишутся в баснях, драматических произведениях названия действующих лиц, выраженные именами, обычно имеющими значение нарицательных, например: **Осел, Пустынник, Паруса** (Крылов), **Леший, Снегурочка, Дед Мороз** («Снегурочка» Островского), **Сокол, Уж** (Горький).

Введено твердое правило правописания прописных букв в притяжательных прилагательных, где наблюдались ранее особенно сильные колебания.

Притяжательные прилагательные, входящие в состав названий, равных по слыслу **«имени», «памяти»**, также пишутся с прописной буквы, например: **Ломоносовские чтения, Пушкинские чтения.**

Притяжательные прилагательные, содержащие в своем составе суффикс **-овск** (**-евск**) или **-инск-**, пишутся со строчной буквы, например: **толстовская усадьба, пушкинская квартира.**

Если же прилагательные, образованные от индивидуальных названий людей, не являются в полном смысле притяжательными, то они пишутся со строчной буквы, например: **пушкинский стиль, суворовская тактика, рентгеновский кабинет.**

Таким образом, новый свод дает целый ряд правил, упорядочивает, приводит к единообразию употребление прописных букв, чем способствует общему повышению грамотного написания.

Л. А. ШЕВЧЕНКО,
преподаватель кафедры русского языка и общего языкознания.

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 200. Тыраж 2000

АТ 01385